Л.А.Малахава,
*дацэнт*

# НАРОДНАЕ МАСТАЦТВА ЯК КРЫНІЦА ЎЗБАГАЧЭННЯ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ МАСТАКОЎ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

Спрадвеку глыбіннае разуменне прыроды і любоў да яе адыгрывалі вялікую ролю ў духоўным і культурным жыцці беларускага народа. Аднак палітычныя і эканамічныя змены XX ст. парушылі традыцыйныя сацыяльныя структуры і перапынілі развіццё народнай творчасці. Новая "народная творчасць" выкарыстоўваецца найперш у камерцыйных мэтах і нярэдка з'яўляецца паўторам традыцыйных узораў.

Таму вельмі цікавым падаецца адкрыццё свету вобразаў прафесійнымі мастакамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі — гэта спалучэнне сусветнага мастацкага вопыту і адукацыі з беларускімі вытокамі, таямнічасці мінулага з сучасным стылем.

Моцна стылізаваныя прыродныя формы, акрэсленыя дэкорам, быццам узнаўляюць свет старадаўніх міфаў і народных паданняў. Мастакі імкнуцца такім чынам увасобіць непасрэдны падыход да натуральнага навакольнага асяроддзя, дзе ва ўзаемаяднанні дасягаюць гармоніі, заснаванай на павазе да ўсіх праяў жыцця.

У пошуках новага візуальнага выяўлення сваіх ідэй мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва усё бліжэй і бліжэй падыходзяць да традыцый народнай творчасці.

Вызначальнай рысай беларускага арнаменту з'яўляецца рытмічны, геаметрычны малюнак, выкрышталізаваны на працягу стагоддзяў з прыродных формаў. Сімволіка, уласцівая геаметрычнаму дэкаратыўнаму малюнку, уключае адначасова і гармонію Сусвету, і законы прыроды ў аднаведнасці з паганскімі вераваннямі. Гэты старадаўні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурны архетып, які зафіксаваны ў археалагічных знаходках II—III стст., збярогся ў наступныя стагоддзі і дайшоў да нашага часу ў якасці асноўнага дэкаратыўнага элемента, які аздабляе і сучасныя дэкаратыўныя рэчы.

Геаметрычны ўзор, нягледзячы на частае яго ўжыванне ва утылітарных рэчах, не быў уключаны ў скарбніцу сучаснага мастацтва. Як неад'емны элемент дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ён набывае новыя эстэтычныя вартасці. Узор, размешчаны на творах дэкаратыўнага мастацтва, атрымлівае новую трактоўку і ацэнку і перадае дух старадаўняй Беларусі. Згадваецца сімвалічнае значэнне формаў, і пэўным чынам працэс атрымлівае зваротнае развіццё. Спачатку натуральныя формы трансфармаваліся ў геаметрычны ўзор. Цяпер гэты ўзор дае сімвалічную трактоўку прыроды. Увогуле апошнім часам сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва набывае больш моцную і выразную нацыянальную адметнасць. Хаця творчасць мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва абапіраецца на матывы беларускага фальклору, яны зусім не маюць фальклорнага характару, бо традыцыйны змест інтрэпрэтаваны таленавітай асобай.

Адным з важнейшых фактараў у фарміраванні мастацкага светапогляду, а затым і стылю з'яўляецца сутыкненне розных культур. Сёння назіраецца змена каштоўнасных арыенціраў. Твору надаецца значэнне не эстэтычнага ўпрыгажэння, а быццам галоўнага камертона, на які настройваецца эмацыянальная атмасфера.

Ідэя філасофскага асэнсавання жыцця набывае розную па эмацыянальнай выразнасці напружанасць. Кожная работа мастака па сваёй ідэі пазнання свету можа быць прынята як праграма творчасці на дастаткова працяглы час, бо творцы дакранаюцца да тэмы, якая ўзнікла не сёння, але не мае рашэння на мове фізічнага знака. Таму звяртаюцца да формаў, даўно асвоеных мастацкай практыкай. Устанаўліваецца гістарычная сувязь, ахопліваючы перыяд зараджэння ўяўлення пра структуру касмічнай сістэмы ў мастацтве і час фарміравання поглядаў, якія ўкараняліся ў паганстве і хрысціянскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэлігіі. Але калі мастаком выкарыстоўваюцца класічныя знакі, яны напаўняюцца сучасным адчуваннем прасторы і сваім разуменнем. Вонкава мастак адзначае гранічную канцэнтрацыю рытмаў, аб'ёмаў і пластычны малюнак ліній, элементаў формы. Так адна ідэя выяўляецца ў розных варыянтах.

Пранікненне ў народнае разуменне мадэлі структуры свету набывае асаблівае значэнне як першы крок у прастору вобразна-эмацыянальнага мыслення ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Т.І.Васюк,
*дацэнт*

## ЗБАН, ГАРШЧОК, ГЛЯК ЯК СІМВАЛЫ ВЕЧНАСЦІ

Многія навукоўцы ў наш час адносяць кераміку да рамесніцкага віду мастацтва, асноўную частку якога складае ганчарства. На наш погляд, кераміка мастацкая і тыражная адносіцца да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Кожны адзінкавы твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва складаецца са зместу і формы. Паміж гэтымі паняццямі існуе непадзельная сувязь. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з'яўляецца агульным паняццем, а твор — адзінкавым. Цікава адзначыць, што кожны асобны твор або выраб як адзінкавая з'ява нясе ў сабе істотныя рысы таго віду мастацтва, да якога ён належыць. Разгледзім суадносіны формы, зместу і мастацкага вобраза ў традыцыйнай і сучаснай беларускай кераміцы, шлях "магічнага" працэсу пераўтварэння звычайнага камяка гліны ў выраб з мастацкімі якасцямі.

Ганчарныя вырабы адрозніваюцца ад пластмасавых, поліамідных або полістыролавых па форме і матрыцы тым, што пластмаса дакладна паўтарае матрыцу вырабу, і ўвесь тыраж мае аднолькавы выгляд. Асаблівасці ганчарных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ